

Я ганаруся тым, што жыву на Навагрудчыне

с. 9

Вечар разбітых ліхтароў

с. 7

Не перамога, а разгром

с. 10



Н
СУБОТА 21.01.2023
№ 5 (10474)

# Новае Жыццё

Навагрудская масава-палітычная газета

**У нядзелю ў навагрудчан будзе магчымасць падтрымаць сваіх землякоў, жыхарак аг. Пятрэвічы Наталлю Юшкевіч і Алёну Кастусевіч, якія прынялі ўдзел у трэцім сезоне папулярнага кулінарнага праекта «Народны повар», які кожную нядзелю раніцай выходзіць на тэлеканале АНТ.**



**Злева-направа: Андрэй Абрамаў, Наталля Юшкевіч, аўтар ідэі, дырэктар дырэкцыі ранішняга вяшчання тэлеканала АНТ Таццяна Рудакоўская, Алёна Кастусевіч, Антон Каленік.**

## «Ан&Ан» на праекце «Народны повар»

Здымкі тэлеперадачы прайшлі загадзя, і мы папрасілі Наталлю Анатольеўну і Алёну Андрэеўну расказаць, што натхніла іх падаць заяўку на ўдзел у праекце, а таксама падзяліцца сваімі ўражаннямі і раскрыць некаторыя сакрэты закулісся.

Трэба сказаць, што гераіням праекта «Народны повар» да сцэны і здымак не прывыкаць. Наталля Юшкевіч не толькі бібліятэкар Пятрэвіцкай сярэдняй школы, але і сапраўдны летапісец мясцовага жыцця, друкуецца ў самых розных выданнях. Яна робіць фотаздымкі і піша пра школьнае жыццё, мясцовыя традыцыі і звычаі, расказвае, чым жывуць і захапляюцца мясцовыя людзі, як праводзяць вольны час. А яшчэ вельмі смачна гатуе і дзеліцца сваімі рэцэптамі не толькі з землякамі, але і на старонках выдання «Настаўніцкая газета». Разам з Алёнай Кастусевіч, матуляй траіх цудоўных дзетак, у вольны час прымалі ўдзел у мясцовых творчых калектывах «Пятрэвіцкі батальён» і «Маладосць». Сакрэтамі кулінарных рэцэптаў Алёна дзялілася і з чытачамі газеты «Новае жыццё». Дык чаму ж не прыняць удзел у тэлеперадачы – і заяўка пададзена, і запрашэнне на здымкі падаспела.

– Па-першае, прыняць удзел у тэлеперадачы «Народны повар» выклікала цікаўнасць. Хацелася даведацца, ці зможа звычайны вясковы чалавек, які не мае дачынення да тэлебачання, трапіць на тэлеканал АНТ, – дзеліцца ініцыятар удзелу ў перадачы Наталля Анатольеўна. – Па-другое, вельмі люблю гатаваць, таму сачу за работай вядомых шэф-повараў. Адным з іх з'яўляецца эксперт шоу – уладальнік тытула World Master Chef Антон Каленік. А з «беларускім каўбоем» – кадарытным фермерам з Браслаўшчыны, вытворцам арганічных прадуктаў Андрэем Абрамавым – знаёмая праз інстаграм, дзе сачу за яго праектам «Вёска XXI стагоддзя». І, па-трэцяе, вельмі захацелася выпрабаваць свае магчымасці.

«Народны повар» – праект не столькі аб ядзе, колькі аб людзях. І асноўнымі крытэрыямі кастынгу з'яўляюцца не толькі кулінарныя здольнасці ўдзельніка. Аднак нашы гераіні паспяхова яго прайшлі.

– У чэрвені запоўніла анкету, а замест невялікага відэароліка пра сябе, адправіла спасылкі на тэлепраграму «Надзея на сяло» пра Пятрэвічы, здымкі якой праходзілі ў нашым аграгарадку і школе, а таксама расказала пра свае захапленні і даслала фатаграфіі страў, якія гатую, – расказвае Наталля Юшкевіч. – Трэба сказаць, што да запаўнення анкеты падышла крэатыўна. Запоўніла яе ў жартоўна-гумарыстычнай манеры, дадала цікавыя факты пра сябе і сваю сям'ю. Выслала публікацыі з «Настаўніцкай газеты». А дзякуючы таму, што шмат гатую, то ў маім партфоліа ўжо меліся даволі цікавыя стравы, якія і былі адасланы на конкурс. На кухні, а яшчэ ў «экстрэмальных» умовах (адзін не «воін»), патрэбен не памочнік, а напарнік, які зразумее цябе з аднаго погляду: ты думаеш, а ён ужо робіць. Прапанавала Алёне паехаць на перадачу. Мы – каманда, якую назвалі «Ан&Ан» (Анатольеўна і Андрэеўна).

Каманда «Ан&Ан» на праекце «Народны повар» упершыню, але са сваёй стратэгіяй: галоўнае для іх не выйграць у гэтым шоу, галоўнае сабе не прайграць!

8 стар.